**УДК 81'42:[811.161.3:82-94] І. Навуменка**

**Тарасава Тамара Мікалаеўна**
доктар філалагічных навук, прафесар,
прафесар кафедры беларускай
і замежнай літаратуры
Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка
Мінск, Беларусь

**Tamara Tarasava**
Habilitated PhD in Philology, Professor,
Professor of the Department of Belarusian
and Foreign Literature
Belarusian State Pedagogical University
named after Maxim Tank
Minsk, Belarus
tamaratarasava@gmail.com

# НАВУМЕНКАЎСКІ АЎТАБІЯГРАФІЗМ І ЯГО АДМЕТНАСЦІ Ў АПОВЕСЦІ "ВІР"

# AUTOBIOGRAPHICAL FEATURES OF I. NAVUMENKA'S PROSE AND ITS CHARACTERISTICS IN THE STORY "WHIRLPOOL"

У артыкуле на прыкладзе аповесці І. Навуменкі "Вір" (1997) разглядаюцца своеасаблівасці аўтарскага аўтабіяграфізму, якому ўласцівы спавядальнасць (самапрэзентацыя ўласнага вобраза ў кантэксце свайго часу), семантычная множнасць "я" ("я" ўнутранага і знешняга, "я" ў мінулым і "я" ў цяперашнім часе), скрупулёзная ўвага да дэталяў, адметная тыпалогія часавых узаемаадносін (непаслядоўнасць фактаў, падзей, фрагментарнасць), кампазіцыйны прыём "рамак". Сфармуляваны вывад пра тое, што навуменкаўскі аўтабіяграфізм як спосаб мастацкага ўвасаблення біяграфічных фактаў у тэксце, як своеасаблівая стылёвая манера пісьменніка стаў важнай стратэгічнай формай увасаблення рэчаіснасці, асэнсавання феномена чалавека як суб'екта быцця.

Ключавыя словы: *І. Навуменка*; *аўтабіяграфізм*; *спавядальны аўтабіяграфізм*; *дэталь*; *часавая арганізацыя твора*; *кампазіцыйны прыём "рамак"*.

The short story "Whirlpool" (1997) by I. Navumenka is analysed in the article to reveal the peculiarities of the author's autobiographical features in the text, which are characterized by the confession style (self-presentation of the author's image in the context of his time), the plurality of "I" (the inner and the outer "I", "I" in the past and present), close attention to detail and to the temporality factor (inconsistency and fragmentation of facts and events), and the frame narrative technique. Navumenka's autobiographical features in his prose became an important strategic way to represent reality, to conceptualize a person as a subject of existence.

Key words: *I. Navumenka*; *autobiographical features*; *confession style*; *detail*; *temporality in fiction*; *frame narrative technique*.

Формы праяўлення пісьменніцкай пазіцыі ў мастацкім творы самыя разнастайныя, найбольш поўна яе прысутнасць выяўляецца ў творы з выразным аўтабіяграфічным пачаткам. Харвацкая даследчыца Магдалена Медарыч піша: "Автобиографизмом мы можем назвать стилистически маркированный литературный прием, представляющий собой эхо жанра автобиографии; он появляется в текстах, которые сами по себе не являются автобиографией, не писались и не воспринимались как автобиографии" [1, с. 5]. У аўтабіяграфічным творы гаворка не ідзе пра дакументальную перадачу падзей пісьменніцкага лёсу, дапускаюцца элементы выдумкі, мастацкай

фантазіі, могуць прысутнічаць сітуацыі, матываваныя імпліцытна, але насамрэч прыдуманыя аўтарам. Тым не менш каштоўнасць аўтабіяграфічных элементаў відавочная, бо яны дазваляюць раскрыць адметнасць аўтарскай асобы, важныя этапы яе самарэалізацыі.

Паняцце *аўтабіяграфізм* можна выкарыстоўваць у дачыненні да любога літаратурнага жанра, але найбольш глыбока яго сэнс праяўляецца ў аўтабіяграфіі, нават калі яна з'яўляецца мастацкай. Пісьменніцкі аўтабіяграфізм уяўляе сабой аб'ектыўны адбітак аўтарскай свядомасці, праз якую асоба творцы раскрываецца ў суадносінах з лёсавызначальнымі падзеямі ў жыцці народа, з універсальнымі праблемамі чалавецтва. У аўтабіяграфічным тэксце пісьменнік можа захаваць некаторыя індывідуальныя рысы ўласнай асобы, але найперш ён стварае тыповы вобраз сучасніка, які жыве ў сваім часе са сваімі клопатамі. Аўтар мадэлюе вобраз аўтабіяграфічнага героя як літаратурны партрэт прадстаўніка адпаведнай эпохі. Навуменкаўскай прозе ўласціва якраз такая форма праяўлення аўтабіяграфізму ў тэксце.

Пэўныя этапы жыццёвага шляху І. Навуменкі – даваеннае дзяцінства, апаленае вайной юнацтва, журналісцкая і выкладчыцкая праца, навуковая творчасць і іншыя біяграфічныя моманты – увойдуць лейтматывамі ў структуру шматлікіх твораў. Даследчык П. Васючэнка заўважыў, што пачатак творчасці пісьменніка быў ужо пазначаны "аўтабіяграфізмам і матывамі «выхавання»" [2, с. 694].

Абагульнены вобраз інтэлігента часоў "хрушчоўскай адлігі" глыбока прадстаўлены ў адным з апошніх твораў І. Навуменкі аповесці "Вір" (1997), дзе відавочна выяўляецца такая форма аўтабіяграфізму, як спавядальны аўтабіяграфізм. Ён скіраваны ў першую чаргу на самапрэзентацыю праз скрупулёзна падабраныя дэталі ўласнага вобраза ў кантэксце свайго часу і мае на мэце раскрыць у мастацкім тэксце найперш глыбока схаваныя ўнутраныя канстанты асобы пісьменніка, фіксацыя ж асобных момантаў біяграфіі аўтара можа быць даволі сціплай і нават спрэчнай. Праўда, гэта не тычыцца аповесці "Вір", бо ў творы выразна прысутнічае сюжэтна-падзейная сувязь паміж біяграфіяй пісьменніка і яго героя Несцяровіча, таму падзейны аўтабіяграфізм відавочны таксама.

Твор І. Навуменкі "Вір" пісаўся ў канцы XX ст., калі выразна праявіўся крызісны стан мастацтва ў нацыянальнай культуры, але тым не менш беларуская проза гэтага перыяду ў лепшых сваіх узорах імкнулася глыбока паказаць духоўны патэнцыял чалавека, выявіць гуманістычны і філасофскі складнік нацыянальнай думкі, самабытнасць роднага слова. І. Навуменка ў межах невялікай аповесці распрацоўвае праблему сацыяльна-маральных стасункаў у асяроддзі навуковай і творчай інтэлігенцыі пасляваеннага часу.

Жыццё выкладчыка-дацэнта вышэйшай школы, будучага пісьменніка Аляксандра Іванавіча Несцяровіча складваецца няпроста. Няўдалы шлюб з першай жонкай Ізольдай, жанчынай эгаістычнай, самаўпэўненай, для якой шлюб быў толькі прыкрыццём свабоднага кахання і *дзе зусім не абавязковая*

*ўзаемная адданасць мужа і жонкі* [3, с. 7], прымусіў хлопца быць больш асцярожным з жанчынамі: *Несцяровіч жанаты другі раз. Можна сказаць, што гэта ягоная драма і нават трагедыя. Ён ажаніўся з дзяўчынай першага, яшчэ школьнага, кахання, хоць прадчуваў, што гэтага не трэба было рабіць. <…> Цяпер, з цягам часу, ён разумее, што Ізольда, першая жонка, яго зусім не любіла, звяртаючы ўвагу толькі на сваю асобу* [Там жа].

З другой жонкай Галінай Несцяровіч пазнаёміўся ў Мінску, калі працаваў выкладчыкам на філалагічным факультэце ўніверсітэта. Гэты саюз аказаўся шчаслівым, сям'я была забяспечанай і матэрыяльна. Галіна мела дасціпны розум, валодала гумарам, заўсёды цікавілася справамі мужа, была клапатлівай жонкай і маці: *Як у віхурным танцы, закружылася каханне Несцяровіча і Галі. <…> Яна досыць начытаная, хоць вучылася ў наргасе, дзе літаратуру нават не выкладаюць. Гаворку з ёй можна весці на любую тэму. І розум у яе дасціпны, і гумарам валодае. Пазней Несцяровіч зразумеў, што была яшчэ адна, можа быць, самая галоўная прычына, якая з'яднала яго з Галяй. Ён быў мяккі, сузіральны, яна – дзейсна-актыўная* [3, с. 11].

Герой Несцяровіч-выкладчык – аўтапсіхалагічны персанаж, ён чалавек творчы, падпрацоўваў у рэдакцыі часопіса "Юнацкі свет", дзе меў магчымасць друкаваць свае нарысы. Яго назіранні за тагачасным літаратурным жыццём удумлівыя, разважлівыя, пазбаўленыя катэгарызму, зайздрасці да таленавітых і кпінаў са слабейшых. Намаляванае аўтарам мікраасяроддзе часопіса тонка фіксуе настроі творчай беларускай інтэлігенцыі, вельмі неаднароднай і далёкай ад ідэалу: *А ў рэдакцыі, аказваецца, былі розныя людзі. Нават такія, што слухалі і запаміналі, перадавалі тое, што ён гаварыў, куды трэба. Прытым, відаць, у пісьмовым выглядзе, магчыма, з уласнымі дабаўкамі і перабольшаннямі* [3, с. 15].

Беларускага пісьменніка І. Навуменку, як заўважае П. Васючэнка, заўсёды цікавіў працэс "фарміравання чалавечай асобы ў зменлівым навакольным свеце" [2, с. 694]. Аўтабіяграфічны герой Несцяровіч свае першыя апавяданні з-за недахопу часу днём пісаў ноччу. Гэта былі нявыдуманыя гісторыі *пра самаахвярнасць сяброў-таварышаў, якія добраахвотна ўдзельнічалі ў антыфашысцкім падполлі, ішлі ў партызаны, на фронт. Іх ніхто не арганізоўваў, не даваў заданняў, яны, калі гаварыць высокімі словамі, па ўласнай волі рызыкавалі жыццямі і нават жыццямі родных, блізкіх* [3, с. 15]. Згаданыя ў аповесці партрэтныя, пейзажныя, побытавыя дэталі выразна характарызуюць атмасферу 60-х гадоў XX ст., умовы працы, адносіны выкладчыка Несцяровіча да калег, сяброў, прафесійнага абавязку. Герой І. Навуменкі з болем успамінае трыццаць сёмы год, калі бясследна знікалі людзі, разважае над неапраўданым раскулачваннем працавітых сялян, адчувае пасляваенную атмасферу падазронасці ў рэдакцыі, дзе працуе. Пачутае вучыла назіральнасці, жыццёвай мудрасці, асцярожнасці.

Несцяровіч-пісьменнік разумее, што праца творцы – справа нялёгкая, яна патрабуе поўнай самааддачы, адпаведнага настрою: *…Пісанне – пакута, –* прызнаецца герой. *– Самая цяжкая работа, якая ёсць на свеце. Вядома,*

*здараюцца выпадкі, калі пішацца лёгка, натхнёна. За адну ноч можа нарадзіцца апавяданне. Але такія ўзлёты духу бываюць рэдка. Галоўнае – праца. Сядзі, прымушай сябе жыць у часе, пра які пішаш, улазь у скуру герояў, у іхнія душы, выяўляй іх імкненні, жаданні. Пісьменнік – той жа артыст. Але своеасаблівы. Бо нават у невялікім апавяданні вымушаны іграць некалькі роляў. І не так проста даецца слова. <...> для пісання трэба час. <...> Ён пасля ўпартага і тым больш удалага пісання нібы выціснуты лімон. Ён стомлены, шчаслівы і пусты* [3, с. 22–23]. Прыведзены ўрывак з аповесці "Вір" надзвычай аўтабіяграфічны, відавочна, што ўнутранае мастакоўскае жыццё – глыбокае і невычэрпнае, пісьменніцкія ацэнкі недагматычныя, а вобраз творцы паўстае як вобраз чалавека разумнага, уважлівага, які ўвесь час знаходзіцца ў творчых і жыццёвых пошуках. Тут мы маем права гаварыць пра адкрыты спавядальны аўтабіяграфізм, герой твора пакутліва ўсведамляе супярэчлівыя змены ў душы, якая знаходзіцца ў пошуках ісціны і балючага разумення той рэчаіснасці, у якой так многа нестабільнасці і хуткаплыннасці. Герой-інтэлігент І. Навуменкі жыве клопатам не толькі пра прыгожае пісьменства, яго, як выкладчыка і даследчыка, хвалююць праблемы тагачаснага літаратуразнаўства, якое не звяртае ўвагі на прыватнае жыццё творцы і тым самым ігнаруе вельмі важны аспект пісьменніцкай лабараторыі.

Выкладчыцкая праца, як лічыць герой, таксама нялёгкая: *Цяжка не лекцыі чытаць. Калі добра падрыхтуешся, асвоіш матэрыял, то стаяць за кафедрай прыемна. Бачыш перад сабой удзячныя твары студэнтаў і выходзіш з аўдыторыі з пачуццём выкананага абавязку. І яшчэ з пачуццём свабоды. Няхай сабе да наступнай лекцыі, якая будзе паслязаўтра ці нават заўтра. І ўсё адно: чытанне лекцый – як прыгон. Выкладчык звязаны імі па руках і нагах. Бо калі лекцыя заўтра, то прыйшоўшы дамоў, паабедаўшы, пачынаеш пра яе думаць. І так месяц за месяцам, год за годам. Гэта нібы ланцугі на нагах* [3, с. 22]. Вышэйназваныя абставіны нараджаюць семантычную множнасць "я": "я" ўнутранага і знешняга, "я" ў мінулым і "я" ў цяперашнім часе. Такім чынам, у спавядальным аўтабіяграфізме пісьменніка мы бачым ускладненую семантыку "я".

Шматлікія жыццёвыя клопаты (вялікая загружанасць на выкладчыцкай працы, беспадстаўныя падазрэнні героя ў быццам бы жончынай здрадзе, сквапная прагнасць былой жонкі да вялікіх аліментаў на сына) выпрабоўваюць героя на сумленнасць, загартаванасць, на цярплівасць. Узмацненне ў прозе І. Навуменкі псіхалагічнага пачатку напрамую звязана з пісьменніцкай увагай да дэталяў, якія здольны выяўляць "схаваныя сэнсы" (Ю. Бораў): *У інтэрнаце асталяваліся два каты. Каб жыццё грунтавалася на разумных пачатках, то каты маглі пароўну падзяліць уладанні. Кожнаму прыпала б па два паверхі з мноствам масіўных чыгунных урнаў, куды студэнты зносілі недаедкі. Але каты сыходзіліся каля якой-небудзь адной урны на другім ці трэцім паверсе, біліся і наладжвалі такія дзікія канцэрты, ад якіх прачынаўся ўвесь інтэрнат. Катоў разганялі, але праз гадзіну яны зноў*

*сыходзіліся і пачыналі лямантаваць* [3, с. 14]. Дасціпнаеназіранне над штодзённым жыццём не пазбаўлена тонкай аналітыкі і філасофскай мудрасці ў спасціжэнні важных законаў быцця. Спавядальны аўтабіяграфізм часта стварае ў аповесці "Вір" эфект дотыку да бóлевых кропак, да ўласна аўтарскіх экзістэнцыяльных праблем, здольных надаць твору жыццёвую дакладнасць і ўзрушанасць.

У аповесці шмат канстатуючых дэталяў (*Жыў па аспіранцкіх інтэрнатах, абараніў дысертацыю, працаваў выкладчыкам, падрабляў у маладзёжным часопісе. Матэрыяльна быў незалежны, хоць аліменты адбіралі значную частку заробку* [3, с. 9] ці *Мінаюць гады. Выходзяць кнігі: адна, другая, трэцяя. Нават нейкае імя ўжо мае Несцяровіч. І вось нарэшце раман* [3, с. 18]). Гэтыя дэталі задаюць адпаведную дынаміку аповяду, ствараюць танальнасць віхурнасці, імклівасці.

Мастацкая дэталь як літаратуразнаўчая катэгорыя ў сціслай форме выяўляе аўтарскую ідэю, становіцца адметным сродкам абагульнення. Побытавыя дэталі пасляваеннага Мінска ў творы характарызуюць сацыяльна-эканамічны ўзровень жыцця народа. Яны дакладна перадаюць атмасферу часу "хрушчоўскай адлігі", калі *многія жыхары трымалі кароў, свіней, курэй, мелі агароды, умелі таўчы ў ступах крупы, а ў ліхую гадзіну на жорнах малоць муку* [3, с. 12]. І. Навуменка праз тонкае адчуванне семантыкі дэталяў падае маштабны малюнак добравядомага яму тагачаснага жыцця.

Гістарычна дакументальны матэрыял эпохі дапаўняецца ў аповесці аўтарскай фантазіяй і яго суб'ектыўнай інтэрпрэтацыяй. Пісьменнік на матэрыяле асобных момантаў сваёй біяграфіі стварае тыповы вобраз інтэлігента 60-х гг. XX стагоддзя. І. Навуменка падрабязна фіксуе псіхалагічную атмасферу ў грамадстве, пакутлівыя творчыя пошукі героя, духоўна блізкага аўтару.

Выпадковаму чытачу выявіць у тэксце аповесці "Вір" прысутнасць аўтабіяграфічных імпульсаў даволі цяжка, і аналізаваць твор праз знешнія біяграфічныя супадзенні аўтарскага"я" і "я" героя/персанажа не варта. Толькі *псіхабіяграфічны* падыход у даследаванні структуры характару персанажа здольны агаліць глыбінныя канстанты душэўнага жыцця аўтабіяграфічнага героя і пісьменніка.

Нельга гаварыць пра тоеснасць паміж аўтарам і аўтабіяграфічным персанажам у творы, бо герой толькі фіктыўна падобны мастаку слова і мае ўпарадкавана-структураваныя погляды, у той час як сістэма поглядаў аўтара пастаянна мяняецца. Індывідуальны ўнутраны вопыт Навуменкі-пісьменніка пашыраецца да ўніверсальных маштабаў мастака-творцы ўвогуле. Праз побытавае, малое выяўляецца вялікае, эпахальнае. Сітуацыі, у якія трапляе герой беларускага пісьменніка, пераканаўча рэальныя, але яны неабавязкова мелі месца ў жыцці аўтара. Сапраўды, нельга не пагадзіцца з даследчыкам А. М. Болдыравай, што "автобиографизм – это принцип преломления автобиографии в художественном творчестве, соотношение художественной и внехудожественной реальности. Такой принцип преломления заключается

в трансформации автором автобиографического, жизненного материала для собственных текстов в наиболее выгодном для автора свете” [4, с. 245]. Несцяровіч, як мы ўжо засведчылі, – персанаж аўтапсіхалагічны, у структуры яго характару ўвасоблены найбольш уласцівыя аўтару рысы, здольныя пры гэтым спалучаць у сабе цэлы спектр пісьменніцкіх іпастясяў і ствараць абагулена-тыповы вобраз эпохі.

У аповесці “Вір” можна вылучыць тры лініі развіцця падзей: лёс героя-пісьменніка, лёс яго пакалення і рух самой гісторыі праз прызму аўтарскага “я”. Сямейна-бытавая тэматыка падаецца ў творы не на ўзроўні апісальнасці, яна цесна пераплецена з псіхалагічным аналізам душэўных перажыванняў Несцяровіча. Такім спосабам пісьменнік пазбягае абытаўлення зместу, маральна-псіхалагічны аналіз застаецца прыярытэтным у творы. Падыход І. Навуменкі да індывідуальнага як звышкаштоўнага цалкам адпавядае характару сённяшняга часу і сучаснаму літаратурнаму працэсу.

Навуменкаўскі аўтабіяграфізм запатрабаваў сваю тыпалогію часавых узаемаадносін. Пісьменнік адмовіўся ад жорсткай паслядоўнасці фактаў, падзей, ён “расчляняе” ўспаміны Несцяровіча на фрагменты, якія мяняюць “фокус изображения” і такім чынам выдзяляюць “припоминаемую деталь крупным планом, останавливающим время” [5, с. 347]. Складаная структура аповесці праяўляецца і ў спалучэнні аповеду пра “я”-героя ў мінулым і “я” ў цяперашнім часе. Відавочна, што ў творы дамінуе ацэнка Несцяровіча жыццёва мудрага, вопытнага, разважлівага. Праз прызму пазнейшага часу глядзіць герой-пісьменнік на даўно мінулыя прыгоды дзяцінства, юнацтва. Часавая арганізацыя твора – істотны для нас момант, бо час падзей, пра якія ідзе гаворка ў тэксце, не супадае з часам аповеду пра іх. Часавая дыстанцыя можа істотна ўплываць на аўтарскую пазіцыю, ацэнку, на ўспрыманне жыцця наогул. У аповесці той, хто апісвае, і той, каго ён апісвае, супадаюць у адной асобе, такім чынам адбываецца “спалучэнне розных часавых планаў” [6, с. 120]. Менавіта гэты ракурс вельмі важны. Супастаўленне некалькіх часавых планаў надае апавядальнай структуры ўсяго твора шматмернасць, нараджае семантычную множнасць “я”-апавядальніка. Парушэнне часава-прасторавых параметраў, пільная ўвага да мікрадэталяў спрыяюць глыбокаму выяўленню пісьменніцкай экзістэнцыі І. Навуменкі ў крызісны час канца ХХ стагоддзя.

У аснове аповесці “Вір” ляжаць рэтраспектыўнае ўзнаўленне падзей і тонка прадуманы кампазіцыйны прыём “рамак” (Б. Успенскі): пачатак твора – Несцяровіч у Доме творчасці падчас зімовай сесіі студэнтаў, канец аповесці – восеньскі Дом творчасці, куды прыехаў дацэнт Несцяровіч для напісання доктарскай дысертацыі. Такое рамачнае абрамленне вызначае часавую перспектыву, гэта значыць, герой глядзіць на сваё жыццё “з часу, пра які ён піша, і часу, у якім ён піша” [5, с. 276]. Абраная форма пабудовы твора сведчыць аб выбары І. Навуменкам жыццёвых каштоўнасцей, пераадоленні ім унутраных канфліктаў, яго стасунках з эпохай, зменлівай, складанай, супярэчлівай.

Такім чынам, мы трактуем аўтабіяграфізм як спосаб мастацкага ўвасаблення біяграфічных фактаў у тэксце, як своеасаблівую стылёвую манеру пісьменніка. Адметнасць яе праяўлення ў творчасці І. Навуменкі заключаецца ў тым, што аўтабіяграфізм (спавядальны і сюжэтна-падзейны) стаў у пісьменніка важнай стратэгічнай формай увасаблення рэчаіснасці. Праз уласны біяграфічны вопыт адбываецца асэнсаванне феномена чалавека як суб'екта быцця, экзістэнцыяльнай рэфлексіі жыцця. Жыццёвы падзейна-эмацыянальны фон актывізаваў творчую актыўнасць пісьменніка, і па-мастацку засвоены факт біяграфіі стаў агульназначным.

Аўтабіяграфізм у аповесці "Вір" – гэта аўтарская мастацкая манера, адметнасць яго эстэтычнай канцэпцыі. Спалучэнне знешніх фактаў гісторыі і фантазіі, рэалій асабістага знешняга і ўнутранага вопыту трансфармуецца І. Навуменкам у мастацка-вобразную сістэму літаратурнага твора, здольнага выявіць глыбінную сутнасць асобы і свету.

## ЛІТАРАТУРА


1. *Медарич, М.* Автобиография/автобиографизм / М. Медарич // Автоинтерпретация : сб. статей по русской литературе XII–XX вв. ; под ред. А. Муратова, Л. Иезуитовой. – СПб. : Изд-во С-Петерб. ун.-та, 1998. – С. 5–32.
2. *Васючэнка, П. В.* Іван Навуменка / П. В. Васючэнка // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы ; навук. рэд.: У. В. Гніламёдаў, В. П. Жураўлёў. – Мінск : Беларус. навука, 2001. – Т. 3 : 1941–1965. – С. 689–713.
3. *Навуменка, І.* Гуканне над верасамі : аповесці, апавяданні / І. Навуменка. – Мінск : Маст. літ., 2002. – 219 с.
4. *Болдырева, Е. М.* Автобиографизм и автобиография: самоконструирование и семиотизация субъекта // Ярослав. вестник. – 2017. – № 4. – С. 242–251.
5. *Николина, Н. А.* Поэтика русской автобиографической прозы : учеб. пособие для вузов / Н. А. Николина. – М. : Флинта : Наука, 2002. – 424 с.
6. *Успенский, Б.* Поэтика композиции / Б. Успенский. – СПб. : Азбука, 2000. – 352 с.


*Поступила в редакцию 19.01.2023*